*Гоўзіч І.М.*

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. V КЛАС



## РАЗДЗЕЛ VI. ПРЫГОДЫ І ПАДАРОЖЖЫ
## МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ «ПРА СМЕЛАГА ВАЯКУ МІШКУ І ЯГО СЛАЎНЫХ ТАВАРЫШАЎ»

1. Запоўніце **крыжаванку**.



**Па вертыкалі:**

*1. Каго маці-мядзведзіца лічыла самым хітрым і небяспечным ворагам?*

*2. Самы любімы лясны ласунак Мішкі.*

*3. Чыя знешнасць апісана наступнымі радкамі: «...быў звычайным, звычайнай пароды. Ні асаблівымі здатнасцямі, ні асаблівымі талентамі ён не мог пахваліцца... Толькі вось бок хіба крыху падпалены, дык гэта ўжо ад паходнага жыцця прыпаліў, ля цяпла грэючыся ў халодную восеньскую ноч?».*

*4. Абавязак Мішкі ў батальёне.*

*5. Закончыце выказванне словам: «Можна падумаць, што Барадаты і Жук такія ўжо адвечныя ворагі і што яны так не паважаюць адзін аднаго. Гэта зноў-такі няпраўда. Калі пазнаёміцца з імі бліжэй, дык мы ўбачым, што яны самыя найлепшыя...»?*

*6. Машына, на якой галоўны герой падняўся ў неба.*

*7. Чыя знешнасць апісана наступнымі радкамі: «...шэрая ўзлахмачаная поўсць, вечна ў рэп'ях, у саломе. Левы рог напалавіну збіты — страціў дзесьці ў гарачых бойках. Куртаты хвост — адна відзімасць. Але затое ж барада — сапраўдная краса і гонар...»?*

*8. Птушка, ганяючыся за якой, Мішка дапамог чырвонаармейцам выбіць з вёскі белапалякаў.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*9. Пачэснае імя, якое далі байцы галоўнаму герою за дапамогу разбіць атрад варожых коннікаў.*

*10. У што апранулі чырвонаармейцы Мішку, каб прывесці яго ў прыстойны для воіна выгляд?*

*11. Жывёла, прызначаная Мішку для кавалерыйскай справы.*

**Па гарызанталі:**

*1. За што Барадаты «пачаў адчуваць да Мішкі вялікую павагу»?*

*2. Які дыягназ паставіў ветэрынар «хвораму» медзведзяняці?*

*11. Чым спакусілі, каб скрасці, байцы суседняга палка да сябе галоўнага героя?*

**Адказы**: *(Па вертыкалі) 1. Чалавек. 2. Маліна. 3. Жук. 4. Артыст. 5. Дружакі. 6. Самалёт. 7. Барадаты. 8. Певень. 9. Таптыгін. 10. Мундзір. 11. Мул. (Па гарызанталі) 1. Махорка. 2. Сімуляцыя. 11. Мёд.*

2. У першым раздзеле «Пра Мішкава дзяцінства і аб тым, як ён маліну любіў» Міхась Лынькоў з пяшчотаю і любоўю апісвае нам узаемаадносіны маці-мядзведзіцы і яе сына. Чаму маці так строга, а часам і жорстка карала за непаслушэнства свайго маленькага сына? Ці можна сказаць, што яна не любіла сына? **Знайдзіце і выпішыце ў літаратурны сшытак 5 прыказак пра мацярынскую любоў.**

3. Адметнасцю сюжэта першага раздзела, з'яўляецца тое, што Міхась Лынькоў па-майстэрску апісаў норaў і павадкі мядзведзяў — маці і сына. Пры дапамозе якіх выразаў пісьменнік паказвае, што гэта ўзаемаадносіны менавіта мядзведзяў? Знайдзіце і запішыце іх у літаратурны сшытак.

| Мішка | Паводзіны | Мішкава Мама |
|---|---|---|
| | | |

4. Якія першыя жыццёвыя ўрокі атрымаў Мішка ад узаемаадносін з маці, жабай, чмялём, вожыкам, дзятлам, вавёркай, і наогул, з акаляючай прыродай ? Намалюйце **ілюстрацыі да** сустрэч героя з жабай, чмялём і вожыкам і падпішыце радкамі з аповесці.

5. Аповесць М. Лынькова называецца «Пра смелага ваяку Мішку...». Наколькі апраўдана ўжыванне слова «смеласць» у першым раздзеле ? Ці ўхваляеце вы гэтыя Мішкавы «смелыя» ўчынкі? Чаму? Паразважайце, чаму пісьменнік назваў Мішку «смелым ваякам», а сабаку і казла — «слаўнымі таварышамі». **Уявіце, што вы Мішка і падрыхтуйце невялікае апавяданне пра сваіх «Слаўных таварышаў».**

6. Чаму Міхась Лынькоў, апісваючы радасць байцоў трэцяга батальёна з-за незвычайнай знаходкі, называе мядзведзя «звярушкаю», а не проста звярком? Што вы можаце сказаць пра свае і аўтарскія адносіны да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўчынку чырвонаармейцаў, якія сілком надзелі на Мішку нашыйнік і забралі яго і сабою? **Паразважайце над пытаннем «Людзі і жывёлы: сябры ці ворагі».**

7. **Складзіце план** раздзела «Дзіўны хворы, цукар і казлоў тытунь» і перакажыце яго.

Прыкладны варыянт плана:

*1. На капцёрскім возе.*
*2. Чырвонаармейцы занепакоіліся.*
*3. Фокуснік.*
*4. Доктарскі агляд.*
*5. Наступствы агляду.*
*6. Непераможны сверб.*
*7. Умяшанне капцёра.*
*8. Сімулянт.*
*9. На новую кватэру.*

8. Складзіце **план** эпізода «Апошні гераічны ўчынак Мішкі». На аснове гэтага плана паспрабуйце зрабіць **кадраплан да дыяфільма** «Апошні гераічны ўчынак Мішкі».

Прыкладны варыянт плана:

*1. Пад канец грамадзянскай вайны.*
*2. Аднойчы позняй восенню ў лесе.*
*3. Дазорны на высокай хвоі.*
*4. Незнаёмыя кончыкі.*
*5. «Няўжо зноў тыя самыя штаны?»*
*6. Паніка сярод варожага войска.*
*7. «— Ну і малайчына, Мішка!»*

9. **Пафантазіруйце і вусна прадоўжыце апавяданне пра герояў твора**. Як склаліся ў далейшым іх жыццёвыя дарогі? Што сталася далей з Мішкам, Вясёлай Барадой і Жуком? Калі ёсць жаданне, напішыце працяг аповесці.

10. Вусна ці пісьмова складзіце **апавяданне** пра сабаку, кошку і г.д., расказаўшы пра цікавае здарэнне з ёй.

11. **Намалюйце ілюстрацыі** да аповесці, наладзьце выставу малюнкаў, параўнайце сваю творчасць з работамі мастака-ілюстратара

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Васіля Александровіча (кніга Міхася Лынькова «Міколка-паравоз. Аповесці і апавяданні» (Мінск., 1989).



12. Вось так выглядае Мішка, а як, на вашу думку, можа выглядаць хлопчык Мішка:





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ